Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (109), 2018

УДК 882.6.09-93

# Канцэпцыя патрыятычнага выхавання ў казках А. Карлюкевіча

Т.М. Пятроўская

У артыкуле аналізуюцца патрыятычны складнік твораў для дзяцей А. Карлюкевіча, сродкі і спосабы, якія аўтар выкарыстоўвае, каб выхаваць актыўнага грамадзяніна сваёй дзяржавы. Пры гэтым патрыятызм разглядаецца як мнагакампанентная структура, прадстаўленая пачуццёва-эмацыянальным, інтэлектуальным і дзейна-практычным кампанентам. Аўтар высвятляе, што патрыятычнае выхаванне ў творы адбываецца праз пазнавальную напоўненасць казак, фарміраванне экалагічнай адказнасці і развіццё эмпаціі да пачуццяў іншых.
**Ключавыя словы:** патрыятычнае выхаванне, дзіцячая літаратура, пазнавальнасць, экалагічнае выхаванне, хрысціянская этыка.

The patriotic components of the books for children by A. Karlyukevich, the ways and means, which are used by the author to educate active citizens of their state, are analyzed. Patriotism is considered to be a many-field structure represented by some sensitive and emotional, intellectual, active and practical components. The author makes a conclusion that the patriotic education in the books by A. Karlyukevich occurs through cognitive fullness of works and forming environmental responsibility and the development of empathy to the feelings of others.
**Keywords:** patriotic education, children's literature, awareness, environmental education, Christian ethics.

Патрыятычны складнік – адзін з самых галоўных аспектаў маральнага і духоўнага выхавання дзіцяці. Разам з тым выхаванне патрыятызму, як правіла, ускладняецца высокай ступенню абстрактнасці гэтага паняцця. У савецкія часы існавала цэласная канцэпцыя любові грамадзяніна да Айчыны, Камуністычнай партыі, савецкага ладу, свайго народа, роднай прыроды, і яна ж гарманічна спалучалася з павагай да іншых народаў. Патрыятычнае выхаванне было цесна звязана з выхаваннем ідэалагічным. З распадам СССР змяніўся і аб'ект, на які накiравана патрыятычнае пачуццё – не стала вялікай шматнацыянальнай краіны. Вывучэнне беларускай гісторыі, традыцый, геаграфіі стала больш значным кампанентам фарміравання грамадзяніна.

Звычайна вызначаюць тры аспекты патрыятызму: пачуццёва-эмацыянальны, інтэлектуальны і дзейна-практычны. Пачуццёвы-эмацыянальны аспект вызначае любоў да ўсяго роднага, гонар за радзіму; інтэлектуальны – веды пра радзіму; дзейна-практычны – актыўныя дзеянні на карысць радзімы. Як бачна, патрыятызм з'яўляецца вышэйшым маральным пачуццём, бо для яго фарміравання неабходна развіццё іншых маральных якасцяў, узбагачэнне ведамі як пра свой родны край, так і ўвогуле пра ўвесь акаляючы свет. Адным з лепшых сродкаў такога развіцця з'яўляецца мастацкая літаратура, у якой гэтыя аспекты рэалізуюцца наступным чынам.

1) Пачуццёва-эмацыянальны – праз займальны сюжэт. Твор павінен зацікавіць дзіцяці, быць актуальным для яго, каб выклікаць пэўныя пачуцці.

2) Інтэлектуальны – праз пазнавальнасць. Вельмі важна, каб інфармацыя, што трансліруецца ў кнізе, была ненавязлівая, не пераўтварала твор у энцыклапедычную даведку.

3) Дзейна-практычны – праз маральна-этычную ідэю. Твор павінен выхоўваць актыўнага грамадзяніна, які спачувае чужой бядзе і паважае іншае меркаванне [1, с. 348].

Творы для дзяцей А. Карлюкевіча – у гэтым сэнсе ідэальнае ўвасабленне патрыятызму як мнагакампанентнай структуры. Патрыятычнае ў казках аўтара выяўляецца праз розныя формы.

1) *Пазнавальны кампанент.* У казках аўтара шмат краязнаўчай інфармацыі, прысутнічаюць тапонімы і гідронімы, а таксама гісторыі, звязаныя з імі. Дарэчы, самым папулярным месцам з'яўляецца вёска Дукора. У Дукору збіраецца Шубуршун з казкі «Прыгоды Шубуршуна», у Дукоры жыве злосны пан з казкі «Як зайка Бяляк мядзведзя Таптыгіна выратаваў». Сам аўтар маленства правёў у вёсцы Зацітава ў Пухавіцкім раёне, у гэтым жа раёне знаходзіцца і вёска Дукора.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пазнавальная інфармацыя ў дзіцячых творах можа даносіцца да чытача як праз аўтара, так і праз персанажаў твора. Крыніцай пазнавальнай інфармацыі ў казках А. Карлюкевіча з'яўляюцца самі героі. Так, у казцы «Вавёрка піша сачыненне» Дзятлік Пятрок зачытвае сачыненне, якое напісаў ён пра свой род. У тым ліку расказвае Дзятлік і пра мясціны, дзе жылі яго продкі, напрыклад, пра Блужскі бор, каля якога некалі была вёска, што спалілі карнікі. Трэба адзначыць, што героі казкі, хоць і не з'яўляюцца людзьмі, але ж ходзяць у сапраўдную школу, менавіта таму сюжэт твора даволі лёгка было б перанесці ў рэаліі звычайнай школы, дзе вучні спрабуюць напісаць сачыненне пра радзіму. Але такі патрыятызм у чыстым выглядзе слаба бы ўспрымаўся дзецьмі. Гульня ў Краіну казачнага, дзе ёсць свая школа для звяроў і птушак, прыцягвае ўвагу. Паказальна, што, калі Вавёрка просіць дапамагчы Дзятліка напісаць сачыненне, той адмаўляе: «Не, Алёнка, такое сачыненне кожны павінен сам напісаць. Пра свае ваколіцы трэба расказваць. І пра сваю сям'ю, і пра свой род. А хто лепей роднай матулі раскажа пра далёкіх і невядомых табе продкаў» [2, с. 10]. Такім чынам, аўтар у казцы сцвярджае, што радзіма – гэта не толькі месца жыхарства, але і ўласная сям'я, яе гісторыя.

Вельмі важна, каб партыятызм пры пэўных умовах не ператварыўся ў шавінізм, менавіта таму патрыятычнае выхаванне прадугледжвае і павагу да іншых народаў. Шмат новага можна даведацца пра замежную краіну з казкі «Памылка першакласніцы Святланкі». Першакласніца атрымала ў школе заданне напісаць сачыненне «Што я ведаю пра Туркменістан?». Тэма для сачынення была абрана невыпадкова. На свята апошняга званка прыедзе пасол Туркменістана, які вырашыў зрабіць вандроўку па мясцінах туркменскага мастака Назара Ёмудскага, што прыязджаў маляваць тутэйшняе Белавежжа. Аўтар лепшага сачынення атрымае магчымасць прабегчы са званком на лінейцы. Святлана папрасіла брата дапамагчы знайсці інфармацыю пра Туркменістан у Інтэрнэце, а той вырашыў пажартаваць і даў няверную інфармацыю. Памылку дзяўчынцы дапамагае выправіць Клякса, якая адводзіць дзяўчынку ў бібліятэку. У выніку сачыненне Святланкі стала лепшым, і пасол прапанаваў ёй з усёй сям'ёй паехаць у Туркменістан. Чытач не толькі зможа даведацца пра далёкую краіну, але адзначыць, наколькі прыгожая і цікавая Беларусь, калі мастак з такой далёкай краіны, абсалютна адрознай ад нашай, прыехаў маляваць яе мясціны. Дарэчы, на гэтым інтэрнацыянальныя сувязі ў казцы не заканчваюцца: Клякса распавядае Святланцы афрыканскую казку пра гіену і зайца. Цікавым у казцы з'яўляецца супрацьпастаўленне Інтэрнэту і бібліятэкі. Святланка давярае Інтэрнэту і памыляецца, а каб атрымаць больш дакладную інфармацыю, адпраўляецца ў бібліятэку. Пры гэтым аўтар не адмаўляе карыснасць разнастайных сучасных гаджатаў для захавання інфармацыі. Напрыклад, у той жа самай бібліятэцы Святланцы выдаюць электронны блакнот, каб было зручней рабіць запісы.

Фарміраванне і развіццё патрыятызму адбываецца праз усведамленне чалавекам сацыякультурнуга асяродку, свайго месца ў грамадстве, значнасці сваёй дзейнасці. Менавіта таму ў якасці пазнавальнага элементу выкарыстоўваецца не толькі краязнаўчая інфармацыя, але народныя традыцыі як элемент беларускай культуры. У казках А. Карлюкевіча ўзгадваюцца як славянскія народныя святы, персанажы славянскай міфалогіі, так і хрысціянскія святы, якія ўспрымаюцца як частка беларускай культуры. У казцы «Зорны шлях гарлачыкаў» аўтар расказвае пра тыя часы, калі яшчэ людзі і птушкі жылі разам. Ад агульнага апісання мірнага суіснавання чалавека і прыроды аўтар пераходзіць да канкрэтнай замалёўкі такога жыцця. Дзед Ладымер у акружэнні сваіх унукаў расказвае пра звычаі, звязаныя з бусламі. Побач тут жа сядзіць бусел Янка, які чымсьці заклапочаны. Прычым бусел не спяшаецца распавядаць пра свае турботы, абцяжарваць імі чалавека. Але, нарэшце, прызнаецца, што не хапае на яго балоце прыгажосці. У вырашэнні праблемы ўключаецца ўся сям'я, і ўжо ноччу сын Ладымера Кастусь падаўся ў гушчар і стрэліў у Млечны шлях, каб на зямлю пасыпаліся знічкі. Цуд у казцы звязаны са святам Сёмухі, які адзначаюць у гэты ж час. Знічкі ператварыліся ў гарлачыкі, якія і ўпрыгожылі балота буслоў. Казачнае ў творы пераплятаецца з народнымі звычаямі і шанаваннем буслоў. Але такое шанаванне мае не экалагічны сэнс, а з'яўляецца праяўленнем любові і павагі да ўсяго жывога, што стварыў Бог. Твор заканчваецца падзякай Богу за тое, што буслоў і чалавека злучыў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Перапляценне славянскай міфалогіі і хрысцінства адзначаецца і ў творы «Як Сяргейка з Жыжалем ядловец ратавалі». Падзеі казкі адбываюцца на Вялікдзень, але разам з тым героі сустракаюцца ноччу з прадстаўнікам язычніцтва – Жыжалем. Сяргейка з татам пайшлі на начную вахту да вяндлярні, дзе малы даведаўся, што вэнджаніна рыхтуецца на дымку ад ядлоўца. Хлопца ўзрушыла гэтая навіна, бо ён ведаў, што ядловец – адна з самых пашанотных лясных культур і расце марудна. Ён просіць бацьку выратаваць рэдкую расліну. На дапамогу прыходзіць Жыжаль – бог агню, які выклікае дождж, каб падмачыць увесь ядловец, і тады яго не будуць чапаць. А Сяргейка з татам вырашылі прайсціся па вяндлярнях і папрасіць не паліць ядловец. Міфалагічная істота амаль ніяк не супярэчыць вялікаму хрысціянскаму святу, бо Жыжаль успрымаецца хутчэй як казачны персанаж. Дарэчы, дастаткова ў творы і пазнавальнай інфармацыі: ад апісання разнастайных традыцыйных страў, што гатавалі раней, да ўзгадвання карысных уласцівасцяў унікальнай для Беларусі расліны – ядлоўца. Асаблівай увагі заслугоўваюць адносіны сына і бацькі. У казках, як правіла, калі здараецца нейкі цуд, дарослыя прысутнічаюць вельмі рэдка. Уваход у Краіну казачнага ім фактычна забаронены, яны з недаверам адносяцца і да аповедаў дзяцей пра цуды. Аднак у дадзенай казцы бацька разам з сынам бачаць Жыжаля. Прычым, сюжэт апавядання запэўнівае, што па-іншаму быць і не магло, бо бацька Сяргейкі – яго сапраўдны сябар. Ён шчыра перажывае боль сына за дрэвы, шукае спосаб дапамагчы. Аўтарытэт бацькі падмацоўвае нават сам Жыжаль, калі ўзгадвае, як тата Сяргейкі выратаваў людзей з пажару. У канцы твора гучаць словы, якія ў чарговы раз падкрэсліваюць важнасць пачуццяў дзіцяці: «Дзякуй табе, сынок! І прабач мне, што за штодзённай мітуснёй я такі клопат абмінуў» [2, с. 77]. Дарэчы, гэты эпізод і ёсць прыклад дзейнага кампаненту патрыятычнага выхавання, калі дзіцяці само спрабуе зрабіць значны для сваёй радзімы ўчынак, а дарослы ва ўсім яго падтрымлівае. У справе выхавання асобы вялікае значэнне маюць творы, у якіх галоўны герой, асабліва калі ён прыблізна такога ж узросту як і чытач, праяўляе якасці актыўнага грамадзяніна ў натуральных умовах, бо нягледзячы на казачную дапамогу, Сяргейка вырашае і сам зрабіць нешта карыснае для выратавання дрэў.

У казцы «Як зайка Бяляк мядзведзя Таптыгіна выратаваў» падзеі адбываюцца на іншае хрысціянскае свята – Благавешчанне. Але і тут аўтар выкарыстоўвае хутчэй культуралагічны, а не маральна-этычны рэсурс свята, а менавіта звязаныя з Благавешчаннем народныя традыцыі. Заяц Бяляк бяжыць у вёску і просіць, каб людзі зладзілі камаездзіцу – славянскі звычай на Благавешчанне. Бяляк вырашаецца на такі смелы ўчынак дзеля выратавання мядзведзя Таптыгіна, сэрца якога загадаў здабыць пан. Народны звычай дапамог прачнуцца мядзведзю, а Бяляк папярэдзіў яго пра небяспеку. Такім чынам, аўтар, з аднаго боку, распавядае пра традыцыю камаедзіцы, яе сувязь з жыццём прыроды, а з другога боку, – паказвае сапраўдныя хрысціянскія адносіны да свайго бліжняга.

2) *Паралельнае экалагічнае выхаванне.* Як правіла, творы на экалагічную і патрыятычную тэматыку вельмі блізкія, бо з аднаго боку, – на захапленні роднай прыродай пабудаваны эмацыянальны аспект патрыятызму, а з другога боку, – спрыяць захаванню прыроды ёсць дзейнасць на карысць сваёй Айчыны, яе будучыні. Экалагічны патрыятызм А. Карлюкевіча выяўляецца ў гарманічным суіснаванні чалавека і прыроды. Такое суіснаванне, напрыклад, паказана ў казцы «Зорны шлях гарлачыкаў», дзе буслы жывуць разам з людзьмі, птушкі нават носяць чалавечыя імёны, а людзі ўсімі спосабамі імкнуцца ўпрыгожыць жыццё буслоў. У казцы «Пісьмо панадцітавік» матылькі таксама носяць чалавечыя імёны, а за дапамогай звяртаюцца менавіта да чалавека. Матылёк Мар'ян Пратычанскі ляціць з пасланнем да Энтамолага, каб той дапамог вырашчыць праблему панадцітавак. Справа ў тым, што на матылькоў усё часцей сталі паляваць кажаны. Мар'ян прылятае да Энтамолага, і той па руху крылаў матылька разумее, што трэба вырашаць нейкую праблему і саджае Мар'яна ў спецыяльны матылятар – электронны перакладчык мовы матылькоў на мову людзей. Энтамолаг знаходзіць корань праблемы: з мясцовасці панадцітавак зніклі пчолы, і матылькі сталі часцей частавацца нектарам ірневуса. Расліна ўплывала на структуру нярвовыхканчаткаў крыльцаў матылькоў, яны страчвалі пільнасць у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

барацьбе з кажанамі. Такім чынам, аўтар даказвае, што ў прыродзе ў кожнага ёсць сваё месца, яе баланс трымаецца за кошт пэўнага парадку. Парушэнне гэтага парадку можа ўплываць на знікненне пэўнага віду насякомага, расліны ці звера. Аўтар дае прыклад не толькі своеасаблівай падтрымкі чалавекам усяго жывога, але і паказвае неабходнасць даследавання прыроды, як тэарэтычная інфармацыя можа дапамагчы вырашыць рэальныя праблемы.

*3) Хрысціянская этыка.* Патрыятычнае выхаванне ў казках А. Карлюкевіча спалучаецца з духоўна-маральным выхаваннем, блізкім да хрысціянскай этыкі. У творах рэдка прысутнічае канфлікт Зла і Дабра, часцей героі ўдзельнічаюць у вырашэнні чужых праблем. У казцы «Зорны шлях гарлачыкаў» стары дзякуе менавіта богу за незвычайнае сяброўства птушак і людзей: «Дзякуй зоркам за тое, што падаравалі буслам такую прыгажосць! – толькі і падумаў стары Ладымер, яшчэ раз падзякаваўшы Богу за тое, што Ўсявышні чалавека і буслоў у сяброўстве злучыў» [3, с. 18]. У творы сцвярджаецца роля чалавека як актыўнага захавальніка прыроды не столькі дзеля сваёй карысці, свайго будучага экалагічна чыстага жыцця, колькі як адказнага наглядальніка за ўсім жывым, што падаравана яму Богам. У аснову казкі «Як васількі на сваю крыўду забыліся» закладзена ідэя служэння на карысць іншым і дзеля іншых. Васількі крыўдзяцца, што нікому не патрэбныя, што селянін радуецца жыту, а не іх прыгажосці. Багіня жніва і земляробства Цэцэра запэўнівае васількоў, што іх прызначэнне – упрыгожваць жыццё таго ж самага жыта ці селяніна, які збірае гэтае жыта. У казцы «Памылка першакласніцы Святланкі» брат за жорсткія жарты не атрымоўвае заслужанае пакаранне, наадварот – сястра запрашае яго «раздзяліць» радасць ад перамогі ў конкурсе, а менавіта адправіцца разам з ёю у Туркменістан. І гэтае запрашэнне горшае за любое пакаранне, бо выклікае ў брата сорам за свой учынак. Казка «Як Бяляк Таптыга выратаваў» – яшчэ адзін прыклад шчырай узаемадапамогі. Заяц спяшаецца папярэдзіць мядзведзя Таптыгіна пра небяспеку, прычым што важна, падзеі адбываюцца пад час Благавешчання. І хаця заяц нясе не зусім добрыя весткі, менавіта такі ўчынак дапамагае мядзведзю выратавацца. Такі накірунак абуджае імкненне быць не раўнадушным да чужой бяды, дапамагаць слабым, дараваць крыўды, актывізуе дзейна-практычны кампанент патрыятызму.

Кнігі маюць незвычайную сілу, асабліва ў справе далучэння людзей да невядомых мясцін, культур, а таксама фарміравання пачуцця гонару за ўласную культуру і сваю рэлігійную спадчыну, яны даюць станоўчы прыклад служэння на карысць Айчыны. Але каб данесці такі сапраўдны дар мастацкага слова да дзяцей, трэба ўлічваць іх узроставыя інтарэсы, спецыфіку патрыятычнага выхавання. Кнігі А. Карлюкевіча – прыклад таго, як дзіцячая кніга можа адначасова быць і займальнай, і выконваць такую складаную функцыю як патрыятычнае выхаванне. Чытаючы іх, дзеці не толькі атрымоўваюць інфармацыю пра родную краіну, але і вучацца нераўнадушна да яе адносіцца, быць яе актыўнымі абаронцамі.

## Літаратура

1. Ясева, Н.Ю. Патриотическое воспитание детей дошкольного возраста / Н.Ю. Ясева // Вектор науки ТГУ. – 2011. – № 3 (6). – С. 346–348.

2. Карлюкевіч, А.М. Зорны шлях белых гарлачыкаў : казкі / А.М. Карлюкевіч. – Мінск : Маст. літ., 2010. – 87 с.

3. Карлюкевіч, А.М. Цёплыя назвы Яе Вялікасці Вады : нарысы і казкі / А.М. Карлюкевіч. – Мінск : Звязда, 2016. – 32 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 20.04.2018

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ